**Караленка, В.** На іх трымаецца зямля / В. Караленка // Патрыёт (Ушачы). — 1989. — 7 кастр. — С. 2.

# НА ІХ ТРЫМАЕЦЦА ЗЯМЛЯ

## Якім ён хлопцам быў



– Якім ён быў? – звярталася да маці Міхаіла – Марыі Платонаўны Хрыпач.

– Лепшы за усіх... Сумела выхаваць, але не змагла зберагчы...

– Якім ён быў? – пыталася ў яго жонкі – Святланы.

– Вельмі добры... Але не змог пастаяць за сябе.

– Не было ў ім нічога незвычайнага. Просты, вясковы хлопец, – адказвалі знаёмыя Міхаіла.

І чым больш пыталася ў родных і знаёмых, разумела, што так яно і было.

Ведаў, што трэба ісці сваім шляхам: трапіўшы на вайсковую службу, выконваць загады да канца.

Ён быў малодшым, чацвёртым сярод братоў, за ім у сям'і Хрыпачоў гадавалася дачка.

Маці ўсё жыццё працавала даяркай, і ён бёгаў да яе на ферму дапамагаць.

Было яму гадоў сем, калі аднойчы прыбег да маці. Надышла пара паіць жывёлу і Марыя Платонаўна пагнала цялят да возера (водаправоду тады не было). За работай не прыкмеціла дзе сын, толькі раптам пачула:

– Мама, а чаму кругом чорна, а толькі тут бела.

...Малы стаяў на льдзіне, якая адплывала ў глыбіню возера.

Гэта паўторыцца яшчэ не раз. Сярод спёкі чарнобыльскага пекла, калі завісаў над рэактарам яго верталёт, у пякучым Афганістане ўсламіналася Міхаілу тая чарната навокал.

Як ён вытрымаў? Відаць, вакол яго ўсё ж заставаўся белы круг, некрануты і непадуладны чарнаце. Ён, нягледзячы на ўсе нягоды, мацнеў.

## Наперадзе жыццё

Усё началося з Віцебскага вучэбнага авіяцыйнага цэнтра ДТСААФ, які Міхаіл скончыў на выдатна. Спадабалася прафесія, неба. Пайшоу ў Вязнікаўскі вучэбны авіяцыйны цэнтр, дзе асвоіў новую мадэль верталёта. Потым скарочаны курс у Сызранскім вышэйшым ваенным вучылішчы лётчыкаў. Выйшаў лейтэнантам з кваліфікацыяй пілот-тэхнік. Быў накіраваны ў Адэсу. У 1983 стаў камуністам.

Там яны і жылі да апошняга часу. Удваіх у чатырнаццаціметровай аднапакаёвай кватэры. Міхаіл і Святлана. НІе скардзіліся, наадварот. Жылі так, як можна толькі марыць, ва усякім разе цяпер. Святлана чакала яго са службы. Калі з'яўлялася вольная хвіліна, ішлі дапамагаць жонцы сябра Віталія, які знаходзіўся ў Афганістане. У рэдкія гадзіны, калі даводзілася некуды выйсці разам, яна абавязкова прымушала фатаграфавацца.

Розныя гэтыя здымкі. Навагоднія, у 1987-м годзе. На вуліцах Адэсы. У сваёй кватэры. Розныя па зместу, але аднолькавыя па сэнсу. Скрозь іх сочыцца шчасце двух маладых людзей, наперадзе якіх – жыццё.

У маі кватэра набыла іншы выгляд: нягледзячы на тое, што ў доме не было гаспадыні (паехала на радзіму ў Полацк), Міхаіл усё вычысціў, вымыў, замяніў нават фіранкі – чакаў прыезду Святланы і толькі што нарадзіўшайся дачкі Дашы. Ён сам назваў яе так. Але кватэра так і не ўбачыла сямейнага шчасця.

Апошні раз яны бачыліся 29 мая 1988года. Ён прыехаў у Полацк, каб забраць з радзільнага дома жонку і дачку.

## Мужчыны ўмеюць маўчаць

У Афганістан ён трапіў другі раз. Першы быў у 1983–84 гадах. Прабыў там год. Вярнуўся з ордэнам Чырвонай Зоркі, атрымаў званне старшага лейтэнанта. Ажаніўся.

Нікому з родных так і не ўдалося дапытацца, за што ён атрымаў узнагароду.

– Не за тое, што з вамі тут сяджу, – адрэзаў аднойчы ў час сямейнага застолля, калі сабраліся разам.

І толькі ў рэдкія гадзіны, калі з добрым настроем прыходзілі ўспаміны, можна было пачуць ад яго нейкія звесткі пра баявое жыццё. Сціпла сказаў аднойчы Святлане, што ратавалі дэсантнікаў. Як гэта было ў дэталях, не дадаў.

У лютым гэтага года, калі нашы войскі яшчэ працягвалі выхад з Афганістана, а яго ўжо не было, карэспандэнты «Праўды» ў артыкуле «Вывад працягваецца» прысвяцілі некалькі, абзацаў іх экіпажу.

«Яны вярталіся тады на «кропку», выканаўшы баявое заданне. І раптам у шлемафонах – голас замыкаючага групы:

– Збіты 565-ы...

– Не зразумеў!

– Збіты 565-ы. «Сцінгерам»...

Развярнуліся. На зямлі каля дарогі палыхаў сноп агню. Зрабілі круг над вогненнай магілай таварышаў. Выклікалі штурмавікоў – «Гракоў», каб тыя прачасалі мясцовасць...

Камандзір збітага верталёта М. Хрыпач вызначыўся яшчэ ў Чарнобылі. Быў прадстаўлены да ордэна. І ў Афганістане праявіў сябе па-геройску. Тут яго таксама прадставілі да ўзнагароды. Не атрымаў ні там, ні тут. Ні пры жыцці, ні пасмяротна».

Гэтыя радкі – першае паведамленне аб прадстаўленні да ордэна «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені. Пасля пэўных затрымак Святлана атрымала ўзнагароду мужа. Сам Міхаіл аб гэтым так і не даведаўся.

...У Чарнобылі ён прабыў з 14 ліпеня па 25 верасня. Завісаў над рэактарам, лётаў туды гадзінамі ў спёку. Іх даўно павінны ўжо былі замяніць але… не знаходзілі замены. Як потым жартавалі хлопцы: «Калі б не Света Хрыпач, мы б там і зазімавалі». Гэта яна праз дзень наведвала камандзіра і патрабавала каб экіпаж нарэшце замянілі. За Чарнобыль ён атрымаў званне капітана.

Як потым высветлілася, у Афганістан у другі раз яго не павінны былі пасылаць, бо перабалеў там хваробай Боткіна. Але, гэта вечнае «але»... Згубілі даведку, што ён, наогул, хварэў.

Аб тым, што ён у Афганістане, не ведаў ніхто з родных. Святлану пры развітанні ён запэўніў: справа вырашана канчаткова – туды ён не трапіць.

І раптам званок з Кагана. Там яны праходзілі адаптацыю, гэта быў яшчэ Саюз, але ўжо на шляху ў Афганістан. Яна крычала, прасіла, каб не ехаў, каб адмовіўся любым шляхам, каб кінуў армію, каб думаў пра дачку.

Не змог. Вось гэта і мела яна на ўвазе, калі казала, што ён не можа пастаяць за сябе.

– Ды і лісты ён даслаў нібы-та з курорту. Пісаў, што хутка вернецца, засталося менш паўгода. Каб я была тады ў Адэсе, я б не дапусціла, – Святлана яшчэ лічыць, што змагла б яго затрымаць. Хаця і была ў іх наконт гэтага цвёрдая дамоўленасць. Міхаіл папярэдзіў: «Калі што, у полк не хадзі. Служба – гэта мая справа».

Дзіўна, што сваімі службовымі навінамі, падзеямі і пачуццямі ён не дзяліўся з роднымі і блізкімі яму людзьмі. Кажуць, калі падзелішся, становіцца лягчэй. А ён трымаў усё ў сабе. Не перакладваў на плечы родных. Трымаў і трываў. Нават аб раненні яго сябра Мікалая Грыцэнкі Святлана даведалася ад іншых. Не хацеў, каб думалі, што там так небяспечна.

… Ляцелі яны ўтрох. Камандзір экіпажа лётчык1-га класа капітан Міхаіл Хрыпач, штурман Сяргей Ашыхмін (які таксама не даведаўся аб нараджэнні сына), борттэхнік Юрый Гаўрысевіч.

Заставалася 5–10 хвілін лёту да аэрадрому, ляцелі на вышыні 10–15 метраў, са скорасцю 200–250 кіламетраў у гадзіну. Іх верталёт быў у сярэдзіне.

1 кастрычніка – роўна год, як ён загінуў, 7 кастрычніка гадавіна яго пахавання і дзень нараджэння – гэтыя дзве даты супалі. Яму б споўнілася 29 гадоў.

Неяк у суседнюю вёску прывезлі з арміі труну без акенца.

– Калі без акенца, значыць там толькі астанкі чалавека, – сказаў тады маці Міхаіл.

Яго труна таксама была глуха зачынена.

А Святлана Хрыпач усё яшчэ спадзяецца, верыць, што яе муж жывы, што трапіў у палон і хутка вернецца. Дае надзею яшчэ і тое, што не супадаюць расказы сяброў аб яго гібелі.

і кліча яго дачка, як дзве кроплі вады падобная на бацьку. Яна яшчэ нічога не разумее, але, відаць, усё адчувае. Не памятаючы бацьку, які паспеў толькі сустрэць дачку пры ўступленні ў жыццё, яна добра ведае яго. На кожным кроку стаяць яго фотаздымкі. Даша, паказваючы на іх, праз пяць хвілін паўтарае: «Тата, тата, тата».

Гэта невыносна, – у Святланы не хапае сіл стрымліваць пачуцці. Дачка – яе адзіная радасць. І вечны балючы напамін.

Вось такое кароткае жыццё звычайнага вясковага хлопца, на якіх, як кажуць, трымаецца зямля. Такім, на белай ільдзіне сярод чарнаты, і застаўся ён у памяці маці. Дваццацівасьмігадовы капітан з чатырма ўзнагародамі. Акрамя названых – ордэн «Звязда» І ступені Рэспублікі Афганістан і ордэн Чырвонага Сцяга – пасмяротна.

**В. Караленка**

**На здымку М. Хрыпач, в. Плігаўкі**